# Паміж Рэспублікай Беларусь і Курскай вобласцю (Расійскай Федэрацыі) падпісаны План мерапрыемстваў на 2017-2019 гады

З мэтай актывізацыі далейшага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Курскай вобласцю, развіцця новых эфектыўных формаў сумеснай дзейнасці 29 чэрвеня падпісаны план мерапрыемстваў на 2017-2019 гады да Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Адміністрацыяй Курскай вобласці Расійскай Федэрацыі аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве.

Дадзены План і складзенае ў 2002 годзе Пагадненне з'яўляюцца асновай узаемнага супрацоўніцтва і адлюстроўваюць асноўныя напрамкі работы.

Падпісанты: Папкоў Сяргей Пятровіч, Грабеннікаў Віктар Мікалаевіч, кіраўнік беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю Расійскай Федэрацыі, Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і старшыня Камітэта Адміністрацыі Курскай вобласці па развіцці знешніх сувязяў.

Даведачна:

З 2009 года за Міністрам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь замацаваная Курская вобласць Расійскай Федэрацыі і ўскладзена персанальная адказнасць за прасоўванне нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у гэтым рэгіёне Расіі і актывізацыю двухбаковых адносін.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/30-06-2017-2107*